# КУЛЬТУРА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ 1992–2004 гг.: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД

*Н.В. Бурая*

У Беларусі пражываюць шматлікія нацыянальныя супольнасці, сярод якіх найбольш уплывовымі, як і раней, застаюцца палякі, яўрэі, татары. Яны з'яўляюцца носьбітамі, якія прынеслі з сабой не толькі свае культуры, але і рэлігіі, якія за стагоддзі моцна паўплывалі на розныя бакі жыцця беларускага народа.

Гістарыяграфія асвятлення нацыянальнага пытання у перыяд 1992–2004 гг. носіць аспектны характар. Не існуе агульнай грунтоўнай працы па раскрыцці пытання дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей. У гэтых працах прааналізаваны пэўныя аспекты.

Да таго ж, канфесійная палітыка вызначана ў працах у большай ступені, чым культурная. Асноўнымі крыніцамі па вывучэнні тэмы з'яўляюцца законы, пагадненні, дагаворы рэспубліканскага і міжнароднага значэння. Пэўную каштоўнасць уяўляюць манаграфіі, артыкулы і дысертацыйныя працы.

Даволі поўнае прадстаўленне аб жыцці розных нацыянальнасцей Беларусі дае калектыўная манаграфія «Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.)» [4]. Тут прадстаўлены розныя бакі жыцця супольнасцей, прасочваецца палітыка дзяржавы ў адносінах да розных канфесій (яўрэяў, палякаў, татар) і агульныя тэндэнцыі развіцця. Грунтоўна адлюстраваны працэс пранікнення вызначаных культур у культуру тытульнай нацыі. Пэўны акцэнт робіцца на характарыстыцы знакамітых асоб, якія належылі да нацыянальных меншасцей і унеслі значны ўклад у папулярызацыю і пашырэнне правоў свайго этнаса.

Даследчыкі разглядаюць розныя аспекты: прававы, сацыяльны, культурны. Праблема «Дзяржава і культура» прапісана ў артыкуле Л. Гуляка [5, с. 277-281], дзе пададзены асноўныя законы па абароне правоў нацыянальных меншасцей, праграма і стратэгічныя напрамкі па рэгуляванні этнаканфесійнай сітуацыі ў Беларусі згодна з унутранай палітыкай дзяржавы і з апошнімі тэндэнцыямі ў грамадстве.

У дысертацыйнай працы Кавалёвай І.В. «Нацыянальная меншасць як аб'ект дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі Рэспублікі Беларусь» [7] прааналізаваны прававыя акты па палажэнні нацыянальных супольнасцей, падаюцца асноўныя накірункі нацыянальнай палітыкі Рэспублікі Беларусь за перыяд 1992–1999 гг., адлюстравана праца органаў дзяржаўнай улады па каардынацыі дзейнасці арганізацый нацыянальных супольнасцей, такіх як Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.

Значны уклад у вывучэнне канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, унёс Л.Я. Землякоў «Дзяржаўна-канфесійныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь»[6]. У сваёй дысертацыі ён прааналізаваў канфесійную сітуацыю на нашых землях праз прызму статыстычных дадзеных (статыстычнае даследванне нацыянальнага склада), таксама прагледжваецца дынаміка развіцця асноўных рэлігійных інстытутаў (праваслаўя, каталіцызму, пратэстантызму, ісламу), што дае

аб'ектыўнае тлумачэнне дзейнасці розных этнасаў (па колькасці вернікаў – дадзеныя на перыяд 1994-1999г.г., па рэлігійных установах, дзеючых і праектуемых).

Вызначальным пунктам яго даследвання з'яўляецца паслядоўны аналіз эвалюцыі палітыкі Рэспублікі Беларусь да нацыянальных і канфесійных меншасцей. У Дадатку выкладзена аўтарская Канцэпцыя дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да рэлігійных арганізацый [6, с. 245-253], дзе ў Пункце 5 прапаноўваецца «садзейнічаць развіццю рэлігійнай самабытнасці карэнных народаў і нацыянальных меншасцей» [6, с. 245].

«Гісторыя канфесій у Беларусі. Мінулае і сучаснасць» [3] А. Верашчагінай і В. Гурко можна выкарыстаць як даведнік па канфесійных пытаннях, так як у дадзенай працы добра асветлены асноўныя рэлігійныя напрамкі, іх гісторыя і сучасны стан, а таксама некаторыя неакультныя напрамкі ў рэлігіі. Гэта сумесная праца з'яўляецца першым комплексным выданнем па пытаннях гісторыі канфесій у незалежнай Беларусі.

Агульнаую інфармацыю аб нацыянальных меншасцях і гісторыі іх пражывання на тэрыторыі Беларусі можна знайсці ў § 12 навуковага дапаможніка «Беларусазнаўства» пад рэдакцыяй прафесара П.І. Брыгадзіна [1]. Тут зме-шчаны заканадаўча-прававыя дакументы па абароне правоў нацыянальных супольнасцей і прадстаўлены гісторыя з'яўлення і палітычныя акалічнасці развіцця, межы пражывання на тэрыторыі Беларусі «народцаў»; таксама прадстаўлена дзейнасць некаторых асноўных супольнасцей (рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, татар, цыган і літоўцаў). Але асноўным недахопам выдання з'яўляецца адсутнасць інфармацыі аб сучасным стане супольнасцей. Таму набыць аб'ектыўную інфармацыю па сучаснай трансфармацыі руху нацыянальных супольнасцей, або зрабіць аналіз па іх дынаміцы немагчыма.

Фарміраванне паняцця «*патрыятызм*» на фоне гістарычных традыцый Беларусі і з улікам асаблівасцей нацыянальнага каларыту з пункту гледжання філасофска-палітычнага аспекту разглядаецца ў калектыўнай працы А.С. Майхровіча, У.І. Боўш, Е.С. Пракашынай «Этнаканфесійныя працэсы ў Беларусі і фарміраванне патрыятызму» [8]. У працы праанелізавана паняцце «дзяржаўнасць» і перададзены асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне нацыянальных адносін, разледжаны такі аспект працэсаў, як «супярэчнасці і салідарызм грамадска-палітычных і духоўна-культурных інтарэсаў нацыянальных супольнасцей» на прыкладзе рускага, яўрэйскага, украінскага, татарскага, польскага, літоўскага народаў.

Ілюстраваны буклет-даведнік па культурах нацыянальных супольнасцей выйшаў у свет у 2005 г. «Беларусь шматнацыянальная» [2]. У ім утрымліваецца кароткая інфармацыя па найбольш буйных нацыянальнасцях Беларусі, іх гісторыя з'яўлення, колькасць прадстаўнікоў на 2005 год, пералічаны асноўныя рэлігійныя святы кожнай супольнасці, культурныя мерапрыемствы; да таго ж, на кожнай старонцы размешчаны фотаздымкі прадстаўнікоў народнасцей у нацыянальным адзенні са святочных рэлігійных мерапрыемстваў.

Магчымасць пазнаёміцца з культурнымі і рэлігійнымі традыцыямі нацыянальных супольнасцей прадстаўляе Каляндар свят. Агульнапрынята ў беларускай перыёдыцы друкаваць агульны каляндар рэлігійных святаў розных канфесій: праваслаўны, каталіцкі, яўрэйскі і мусульманскі. Тым самым, адзначаецца роўнасць усіх рэлігій і павага да кожнай нацыянальнасці.

Такім чынам, пры аналізе дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да нацыянальных супольнасцей у перыяд паміж дзвюма рэдакцыямі Закона «Аб нацыянальных меншасцях»(1992-2004г.г.) неабходна вызначыць яе грунтоўную прадуманасць і паслядоўнасць ва ўзаемастасунках з тытульнай нацыяй.

### ***Спіс выкарыстаных крыніц***


1. Беларусазнаўства: Навуковы дапаможнік / пад рэд. П.І. Брыгадзіна. – Мінск: Завігар, 1998. – С. 210–233.
2. Беларусь шматнацыянальная: буклет-даведнік [склад. Міхальчук]. – Минск.:Рыфтур, 2005.
3. Верашчагіна, А. Гісторыя канфесій у Беларусі. Мінулае і сучаснасць: дапам. для настаўнікаў / А. Верашчапна, В. Гурко. – Мінск.: Тэхналогія, 2000.
4. Грыгор'ева, В.В. Канфесіі на Беларусі (к.XVIII-XXст.ст.) / В.В. Грыгор'ева [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 1998.
5. Гуляка, Л. Роля дзяржавы і грамадства ў захаванні нацыянальных культур / Л. Гуляка // Разнастайнасць моў і культур у кантэсце глабалізацыі: матэр. міжнар. сімпоз., Мінск, 9-10 ліп. 2002 г.: у 2 кн. / редкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 277–281.
6. Земляков, Л.Е. Дзяржаўна-канфесійныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь: дыс. ... д-ра паліт.навук: 23.00.02 / Л.Е. Земляков. – Мінск, 1999.
7. Ковалёва, И.В. Национальное меньшинство как объект государственной национальнай политики Республики Беларусь: дис. ... канд. политич. наук: 01.00.07 / И.В. Ковалёва. – Мінск, 2003.
8. Майхрович, А.С. Этноконфессиональные процессы в Беларуси и формирование патриотизма. / А.С. Майхрович, В.И. Бовш, Е.С. Прокашина. –2-е изд. – Минск: ИООО Право и экономика, 2004.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ